**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за сакавік 2024 г.

## Мерапрыемствы да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

**14-15 сакавіка. Кобрын.**

Да 30-годдзя з дня прыняцця Асноўнага закона Рэспублікі Беларусь у ПЦПІ цэнтральнай раённай бібліятэкі прайшоў цыкл разнапланавых мерапрыемстваў: прававы экскурс «Гісторыя Канстытуцыі - гісторыя краіны», круглы стол «Размова аб важным», інтэлектуальная гульня «Вучуся быць грамадзянінам», гутарка ля кніжнай выстаўкі «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь - аснова ўстойлівага развіцця беларускага грамадства», інтэлектуальна-прававая віктарына, сітуацыйныя заданні, пазнавальна-гульнявы турнір «Знатоки Конституции», экскурс у ПЦПІ бібліятэкі.

ЦРБ, 82 чал.

**16 сакавіка, Кобрын.**

Да 30-годдзя з дня прыняцця Асноўнага закона Рэспублікі Беларусь бібліятэка правяла квэст «Знакі краіны – гісторыя народа Беларусі» для навучэнцаў пачатковых класаў.

Лукская ПБ, 15 чал.

## Мерапрыемствы да Дня праваслаўнай кнігі

**14 сакавіка. Кобрын.**

Бібліятэка правяла ўрок праваслаўя «Вера вечная, вера хвалебная, вера наша праваслаўная» для навучэнцаў школы і жыхароў вёскі з ўдзелам: ігумена Петрапаўлаўскага храма – айца Аляксандра, рэгента храма – Кобрынец А. П., бібліятэкара Петрапаўлаўскай царквы – Валасюк Н. С., бібліятэкара Сабора Аляксандра Неўскага г. Кобрына – Засім О. Ф., дырэктара Залескай СШ – Алейнік А. Е., намесніка па выхаваўчай працы Голад Т. У., бібліятэкара Залескай СШ – Якаўчук Н. В.

Залеская ПБ, 76 чал.

**14 сакавіка. Кобрын.**

Ігумен храма Архістратыга Міхала агр. Навасёлкі іерэй Сергій прынял удзел у гадзіне праваслаўнай кнігі «Праз кнігу да духоўнасці», якая арганізавана ў бібліятэцы для навучэнцаў сярэдніх класаў.

Навасёлкаўская ПБ, 20 чал.

## Мерапрыемствы, прысвечаныя тэме генацыда беларускага народа

**1-28 сакавіка. Кобрын**

У рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» у цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў цыкл мерапрыемстваў: патрыятычная гадзіна «Годы геноцида – века печали», гадзіна-рэквіем «Один день в лагере смерти». Удзельнікамі мерапрыемстваў сталі навучэнцы старэйшых класаў школ горада і раёна.

ЦРБ, 241 чал.

**22 сакавіка. Кобрын.**

Да Дня памяці ахвяр Хатынскай трагедыі ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла патрыятычная гадзіна «Хатынь - святыня нацыянальнай памяці» для навучэнцаў старэйшых класаў СШ №3.

ЦРБ, 25 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 сакавіка. Кобрын.**

Натарыусамі натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Надзеяй Іванаўнай Дашук і Святланай Аляксееўнай Зарэцкай праведзены бясплатнае індывідуальнае кансультаванне грамадзян па натарыяльных пытаннях, а таксама адбыліся лекцыйныя заняткі з навучэнцамі ДУА «Сярэдняя школа № 4 г. Кобрына» у рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва».

ЦРБ, 28 чал.

**1 сакавіка. Кобрын.**

Прайшоў урок здароўя «А сладок ли запретный плод?», прымеркаваны да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам. Студэнты Кобрынскага ДПТК праслухалі выступленні урача па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святланы Васільевай, урач-эпідэміёлага Кобрынскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірыны Ператолчынай і іерэя Свята-Хрыстараждзественскай царквы Андрэя Шаўчука.

ЦРБ, 35 чал.

**12 сакавіка. Кобрын.**

Сустрэць прыход вясновай пары года ў атмасферы творчага абмену на музычна-паэтычным вечары «Мы дарим людям искры вдохновенья» вакальны гурт «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі прапанаваў сваім таленавітым сябрам: клубу «Вдохновение» Кобрынскага ТЦСАН, членам літаратурнага клуба «ПаэтыКо», падапечным псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў.

ЦРБ, 61 чал.

**14 сакавіка**

Чарговае навучанне кадраў у ГУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» прайшло ў форме краязнаўчых чытанняў «Жыццё са знакам якасці» у рамках раённага конкурсу «Імя ў летапісе малой радзімы».

ЦРБ, 26 чал.

**16 сакавіка. Кобрын.**

Бібліятэкар арганізавала правядзенне V раённага конкурсу беларускай паэзіі і песні «Беларуская мова – мелодыя душы» ў намінацыі «Беларуская паэзія» ў трох узроставых катэгорыях.

*(Елізарава, Ж. Беларуская мова – мелодыя душы / Ж. Елізарава // Кобрынскі веснік. – 2024. – 23 сакавіка. – С. 8).*

*Залеская ПБ, 74 чал.*

**22 скавіка. Кобрын.**

Кобрынскія паэты - член Саюзу пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Наталля Кондрашук і члены клуба Марына Міхалюк і Ксенія Пытляк - прынялі ўдзел у творчай анлайн-сустрэчы ў Міжнародным літаратурным клубе ім. Льва Талстога «Славянские поэты и писатели в мировой культуре» і ў літаратурным марафоне «Звучи, славянское слово».

ЦРБ

**22 сакавіка, Кобрын.**

Прайшоў Міжрэгіянальны турнір па СКАНВОРДЫНГУ сярод падапечных тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Брэсцкай вобласці, які праводзіцца ў рамках рэалізацыі мерапрыемстваў Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце – 2024» і мерапрыемстваў прымеркаваных да Года міру і стварэння.

ЦРБ, 26 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3-85-81